Напярэдадні 80-годдзя з часу заснавання кобрынскай бібліятэкі бібліёграфамі цэнтральнай раеннай бібліятэкі выдадзены рэкламна-інфармацыйны спіс «Чытай, краіна, пра нас пішуць! : бібліятэка на старонках СМІ»
.




У сучасным свеце бібліятэкі ўсё часцей становяцца аб'ектамі сродкаў масавай інфармацыі. Публікацыі ў прэсе аказваюць найбольш пераканаўчае ўздзеянне з пункту гледжання піяру бібліятэкі ў рэгіёне, акумуліруюць увагу ўлад, а таксама існуючых і патэнцыяльных наведвальнікаў бібліятэкі, знаходзяць сваю ўдзячную аўдыторыю.
Рэкламна-інфармацыйны спіс прапануе публікацыі ў друку аб рабоце Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Змяшчае артыкулы, напісаныя карэспандэнтамі перыядычных выданняў, а таксама супрацоўнікамі бібліятэкі.
Уключаны артыкулы з перыядычных выданняў на беларускай і рускай мовах за 15 апошніх гадоў (2004-2019). Бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца ў зваротным

храналагічным парадку, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу даюцца кароткія даведачныя анатацыі.
Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.
Пры складанні бібліяграфічнага паказальніка выкарыстаны краязнаўчы каталог, раздзел сайта Кобрынскай РЦБС «Мы ў друку». Адбор літаратуры закончаны ў жніўні 2019 года.